Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


навукі ў Беларусі, некаторыя з іх захоўваюць сваю актуальнасць і як навуковыя творы, што сведчыць аб найвысокім узроўні прафесіяналізму, якога беларускія даследчыкі сумелі дасягнуць у кароткі тэрмін існавання Інбелкульта.

*Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт): гісторыя ўзьнікненьня, сучасная структура, навукова-даследчая дзейнасць / Ін-т беларус. культуры ; апрац. навук. сакратар Інбелкульту А. І. Цьвікевіч. – Менск : ДВБ, 1926. – 114 с.
2. Бюлетэнь, 1926–1927 / Ін-т беларус. культуры. – Менск : ІБК, 1927. – № 1. – 67 с.
3. Бюлетэнь, 1927–1928 / Ін-т беларус. культуры. – Менск : ІБК, 1928. – № 2. – 115 с.
4. Статут Інстытуту беларускае культуры / Ін-т беларус. культуры. – Менск : [б. в.], 1927. – 13 с.


**УДК [025.2+025.171](476-25):094**

# Гісторыя фарміравання і вывучэння калекцыі кірылічных выданняў ЦНБ НАН Беларусі

***Цітавец Алена Іосіфаўна***,
*кандыдат гістарычных навук,*
*загадчык сектара кнігазнаўства аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў*
*Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

***Аннотация:*** *Автор раскрывает историю формирования коллекции кириллических изданий ЦНБ НАН Беларуси на основе воспоминаний первых сотрудников отдела редких книг и рукописей, созданного в 1964 г. Прослеживает путь изучения коллекции от первых публикаций до составления каталогов.*

***Ключевые слова:*** *кириллические издания, формирование коллекции, изучение старопечатных книг.*


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by1

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by





Калекцыя кірылічных выданняў ЦНБ НАН Беларусі налічвае 548 асобнікаў XVI – пачатку XX ст. Яна пачала фарміравацца разам са стварэннем аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў у 1964 г. Мяркуем, што асобныя кірылічныя выданні маглі быць і ў даваенным фондзе бібліятэкі, але звестак пра іх мы не знайшлі.

Успаміны былых супрацоўнікаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Валянціны Вячаславаўны Білевіч, Лідзіі Іванаўны Збралевіч, Аліны Іванаўны Чарняевай даюць магчымасць найбольш яскрава ўявіць, «убачыць», як гэта адбывалася. Вялікая заслуга ў камплектаванні фонду належала адной з першых загадчыкаў аддзела Л. І. Збралевіч (1930–2012). Першым крокам яе дзейнасці ў гэтым накірунку стаў адбор з агульнага фонду бібліятэкі выданняў, што падпадалі пад крытэрый рэдкасці. Яны і сталі асновай калекцый аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў [1, с. 239].

А. І. Чарняева распавядала: «В хранилище отдела в начале его существования не были смонтированы стеллажи и книги складывались на пол, накрывались тканью, старыми шторами. Называли мы эту «конструкцию» «роялем». Она (конструкция) действительно была похожа на большой концертный рояль… В процессе отбора литературы «рояль» становился все больше и объёмнее. А когда установили стеллажи, мы сразу занялись разбором книг по коллекциям и расстановкой их на полки» [2].

Значную ролю ў папаўненні калекцыі адыграла праца по пошуку кніг у дублетных фондах не толькі бібліятэк Мінска, абласных бібліятэк (Магілёў, Гомель, Гродна), але і Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Леніна, Бібліятэкі АН СССР (Ленінградскае аддзяленне) [1, с. 240].

Пераважная большасць асобнікаў была атрымана з дублетных фондаў Музея кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Леніна (цяпер Расійская дзяржаўная бібліятэка – РДБ), напрыклад, у 1965 г. паступіла 156 кірылічных стaрадрукаў, кнігі з характэрнымі паметамі Музея кнігі РДБ паступалі і ў 1972 г. і пазней [3].

Самыя раннія старадрукі з РДБ: Псалтыр (Вільня, 1576); Васіль Суражскі. «Аб адзінай сапраўднай праваслаўнай веры» (Астрог, не раней 1588); Актоіх. Ч. 1 (Масква, 1594, асобнік К16-18/Ср201); Актоіх. Ч. 2 (Масква, 1594, асобнік К16-18/Ср199); Псалтыр з паследаваннем (Астрог, 1598); Мінея агульная (Масква, 1600).

Адным з самых актыўных партнёраў ЦНБ НАН Беларусі па ўнутрысаюзным кнігаабмене была Бібліятэка АН СССР. Адтуль у 1968 г. у якасці падарунка паступілі кнігі, у тым ліку асобнік «Граматыкі» Мялеція Сматрыцкага (М., 1648. Экз. К16-18/Нр75). На ім прастаўлены авальны штамп: «БИБЛИОТЕКА Акад. Наук СССР Отд. Особ. Фонд». На форзацы налепка: «ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКЕ им. ЯКУБА КОЛАСА АКАДЕМИИ НАУК БЕЛОРУССКОЙ ССР – ДАР от БИБЛИОТЕКИ АКАДЕМИИ НАУК СССР Ленинград 23 сентября 1968 г.».



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by2

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



Верагодна, гэты падарунак быў прымеркаваны да святкавання 50-годдзя БССР (утворана 1 студзеня 1919 г.). У акадэмічнай бібліятэцы, як і ва ўсёй рэспубліцы, да юбілею актыўна рыхтаваліся, у 1968 г. былі арганізаваны выставы «Савецкай Беларусі – 50 гадоў», «50 лет БССР и КПБ» [4, с. 22, 64, 65]. У гонар гэтага юбілею 29 снежня 1968 г. у Мінску нават прайшоў ваенны парад і дэманстрацыя працоўных. Падораны ж асобнік Граматыкі (і не толькі) перамясціўся ў фонд аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі.

Калекцыя папаўнялася і асобнікамі з мінскіх кнігазбораў. Па ўспамінах В. В. Білевіч (1929–2013): «Целыми неделями мы буквально «рылись» в дублетных фондах Правительственной библиотеки, которые тогда находились в подвальном помещении на ул. Первомайской (с. 236) ». «Интересными и значительными были также находки в дублетных фондах Библиотеки им. Ленина[1]. Помню, как мы находили издания XVIII века в нынешнем костеле Св. Роха, где тогда хранилась часть их дублетных фондов [5, с. 236].

Такім чынам, відаць, трапіў у калекцыю асобнік Псалтыра (Магілёў, 1757. Экз.: К16-18/Нр144). На яго тытульным аркушы ледзь бачныя штампы: «Дублетны Фонд Урадавай бібліятэкі №25393»; «Урадавая (?) Бібліатэка БССР (?)»;« [Б]ССР [Дзяржбі]бліатэка [імя У. І.] Леніна [№]».

Не менш цікавая бібліятэчная пазнака – «БК/2300» [бібліятэка Карскага]. Як вядома, акадэмік Яўхім Фёдаравіч Карскі ў 1921 г. падарыў свой асабісты кнігазбор Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, бібліятэка каторага ператварылася ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У. І. Леніна. Там, пэўна, захоўваўся Псалтыр да Вялікай Айчыннай вайны і там была прастаўлена адзнака «БК 2300». У час акупацыі частка фонду бібліятэкі была вывезена ў Германію, частка знішчана ці разрабавана. Пасля вайны асобнік нейкі час захоўваўся ў запасніках Урадавай бібліятэкі БССР, потым быў перададзены ў аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі [6].

Па ўспамінах Л.І. Збралевіч, сур'ёзнай базай камплектавання сталі антыкварныя і букіністычныя кнігарні. Букіністычны гандаль у Беларусі не быў такі маштабны, як у Маскве і Ленінградзе. Была наладжана перапіска з букіністычнымі кнігарнямі Вільнюса, Каунаса і Рыгі [1, с. 243, 246].

У архіве аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захавалася перапіска Л. І. Збралевіч і В. В. Білевіч са стараабраднікамі Н. М. Сарокіным (1904–1974) з Відзаў і М. С. Севасцьянавым, з Растова-на Доне (1928–2006). У выніку гэтых перамоваў і дамоўленасцяў у Сарокіна было набыта некалькі рукапісных і старадрукаваных кніг. У М. С. Севасцьянава ў 1973 і 1991 гг сярод іншых была куплена 71 старадрукаваная кірылічная кніга і 97 рукапісных [7].

Ад пачатку стварэння калекцыі кірылічных выданняў апісаннем кніг займалася В. В. Білевіч. У 1974 г. яе камандзіравалі на стажыроўку ў Маскву ў РДБ

[1] *Маецца на ўвазе Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі).*





Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by3

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


на курсы павышэння кваліфікацыі, дарэчы, у аддзеле захаваліся яе акуратныя канспекты. Паводле атрыманых рэкамендацый, яна праводзіла апісанне па сістэме Антаніны Зёрнавай на картках вялікага фармата ўручную.

У 1976 г. выйшла яе публікацыя «Белорусские книги кирилловской печати XVI–XVII веков в фондах ФБАН БССР», у якой упершыню было прадстаўлена апісанне асобнікаў калекцыі кірылічных выданняў [8]. Асобнікі з фондаў бібліятэкі былі адлюстраваны ў зводных каталогах: «Кніга Беларусі, 1517–1917» (1986), «Издания кирилловского шрифта второй половины XVI века» (2003) [9].

З цягам часу фонд калекцыі папоўніўся, неабходна было ўводзіць у навуковы абарот новыя асобнікі, а склад і аб'ём інфармацыі пра раней апісаныя кнігі ўжо патрабавалі дапаўнення і пэўнай карэкцыі. У 2014 г. у бібліятэцы была распачата работа па стварэнні серыі каталогаў кірылічных выданняў XVI – пачатку XX ст. з мэтай максімальна поўнага навуковага апісання кожнага асобніка з улікам апошніх дасягненняў кнігазнаўства. У 2017 г. выйшаў з друку каталог з апісаннем 25 асобнікаў 20 выданняў XVI ст. (перавыдадзены ў 2018 г.). У 2019 г. – каталог з апісаннем 21 асобніка 25 выданняў XVII ст., выпуск 1 (1602–1620-е гг). У 2020 – каталог з апісаннем 22 асобнікаў 18 выданняў XVII ст., выпуск 2 (1626–1638 гг.). Над каталогамі працавалі В. А Губанава, І. Л. Мурашова, Я. А. Палякоў, П. Д. Скурко, А. І. Цітавец (адказны складальнік). На лістапад 2022 г. запланаваны выхад каталога з апісаннем 28 асобнікаў 17 выданняў XVII ст., выпуск 3 (1638–1644), падрыхтаваны макет каталога з апісаннем 21 асобніка 19 выданняў XVII ст., выпуск 4 (1644–1648 гг.).

Усе каталогі суправаджаюцца вялікімі прадмовамі, якія з'яўляюцца асобнымі даследаваннямі ў галіне кнігазнаўства, гісторыі, крыніцазнаўства. Сабраная, сістэматызаваная і класіфікаваная ў каталогах інфармацыя з высновамі і каментарыямі аўтараў-складальнікаў надае каштоўны матэрыял для далейшых даследаванняў.

Праца па вывучэнні калекцыі кірылічных выданняў ЦНБ НАН Беларусі працягваецца. Вынікі гэтых даследаванняў рэгулярна друкуюцца ў зборніках матэрыялаў міжнародных канферэнцый і семінараў: «Кнігазнаўчыя чытанні», «Берковские чтения», «Румянцевские чтения», «Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития» [11].

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Збралевич, Л. И. Из истории формирования фондов отдела редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси / Л. И. Збралевич // Путь длиною в полстолетия : к 50-летию образования отд. ред. кн. и рукоп. Центр. науч. б-ки им. Я. Коласа НАН Беларуси ; сост. А. В. Стефанович, М. М. Лис ; редкол. : А. И. Груша (гл. ред.) [и др.] – Минск, 2015. – С. 239–346.


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by4

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


2. Черняева, А. И. Мои воспоминания о некоторых событиях в истории отдела / А. И. Черняева // Путь длиною в полстолетия : к 50-летию образования отд. ред. кн. и рукоп. Центр. науч. б-ки им. Я. Коласа НАН Беларуси ; сост. А. В. Стефанович, М. М. Лис ; редкол. : А. И. Груша (гл. ред.) [и др.] – Минск, 2015. – С. 257–260.
3. Титовец, Е. И. Кириллические издания с пометами Музея книги Российской государственной библиотеки / Е. И. Титовец // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития = Modern Problems of Book Culture: Main Tendencies and Prospects : материалы XIV Белорус.-Рос. науч. семинара-конф., Москва, 24–25 нояб. 2021 г. / сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: А. И Груша [и др.]. – Минск ; М., 2021. – С. 472–478.
4. Отчет о работе библиотеки Академии наук БССР за 1968 год. – Минск, 1969. – Б. с.
5. Билевич, В. В. Из моих воспоминаний о работе в отделе редких книг и рукописей / В. В. Билевич // Путь длиною в полстолетия : к 50-летию образования отд. ред. кн. и рукоп. Центр. науч. б-ки им. Я. Коласа НАН Беларуси ; сост. А. В. Стефанович, М. М. Лис ; редкол. : А. И. Груша (гл. ред.) [и др.] – Минск, 2015. – С. 234–239.
6. Цітавец, А. І. Калекцыя беларускіх брацкіх выданняў XVII–XVIII ст. у фондзе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі / А. І. Цітавец // Матэрыялы Першых Кнігазнаўчых чытанняў. – Мінск, 2000. – С. 69–74.
7. Титовец, Е. И. Рукописные книги старообрядцев Севастьяновых в Центральной научной библиотеке НАН Беларуси / Е. И. Титовец // Язык, книга и традиционная культура позднего русского Средневековья в науке, музейной и библиотечной работе : тр. IV Междунар. науч. конф. «Мир старообрядчества» : сб. науч. ст. / [редкол.: Ю. С. Белянкин и др. ; сост.: Ю. С. Белянкин, Е. В. Воронцова, Н. В. Литвина]. – М., 2019. – Вып. 10. – С. 395–405.
8. Билевич, В. В. Белорусские книги кирилловской печати XVI–XVII веков в фондах ФБАН БССР / В. В. Билевич // Из истории книги в Белоруссии. – Минск, 1976. – С. 93–112.
9. Галенчанка, Г. Я. Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI–XVIII ст. / Г. Я. Галенчанка // Кніга Беларусі, 1517–1917 : звод. кат. – Мінск, 1986. – С. 9–192 ; Гусева, А. А. Издания кирилловского шрифта второй половины XVI века : свод. кат. : в 2 кн. / Рос. гос. б-ка ; под общ. ред. Л. И. Сазоновой. – М., 2003. – Кн. 1–2.
10. Кириллические издания XVI века из коллекции Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси : каталог / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост.: Е. И. Титовец (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: А. И. Груша (гл. ред.) [и


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by5

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



др.]. – Минск : Беларус. навука, 2017. – 297 с. : ил. (переизд. в 2018 г.) ; Кириллические издания XVII века из коллекции Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси : каталог / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост.: Е. И. Титовец (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: А. И. Груша (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2019. – Вып.1. – 503 с. : ил. ; Кириллические издания XVII века из коллекции Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси : каталог / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост.: Е. И. Титовец (отв. сост.), О. А. Губанова, П. Д. Скурко ; редкол.: А. И. Груша (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2020. – Вып. 2 : 1626–1638 гг. – 304 с. : ил.

11. Губанова, О. А. Московские Святцы 1646 г. : из истории бытования одного экземпляра // Матэрыялы XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 28–29 красавіка 2022 г. / Нац. б-ка Беларусі ; [склад.: Т. У Карнілава, Г. У. Кірэева ; рэдкал.: А. Ю. Кніжнікава (старш.) і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 58–63 ; Поляков, Е. А. Из истории рукописной записи, обнаруженной в экземпляре Трефологиона, декабрь-февраль (Москва, 1638) // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов, 2021 : материалы VI Междунар. науч. конф., Гродно, 26–27 мая 2021 г. / Междунар. ассоц. акад. наук, Науч. совет по книгоизд. [и др.] ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: Л. А. Авгуль [и др.]. – Минск ; М., 2021. – С. 455–461 ; Титовец, Е. И. Кириллические издания с пометами Музея книги Российской государственной библиотеки / Е. И. Титовец // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития = Modern Problems of Book Culture: Main Tendencies and Prospects : материалы XIV Белорус.-Рос. науч. семинара-конф., Москва, 24–25 нояб. 2021 г. / сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина, ; редкол.: А. И. Груша [и др.]. – Минск : Центр. науч. б-ка НАН Беларуси ; М. : ФГБУ науки Науч. и изд. центр «Наука» РАН, 2021. – С. 472–478 ; Титовец, Е. И. Книги из Румянцевского музея в коллекции кириллических изданий ЦНБ НАН Беларуси / Е. И. Титовец // Румянцевские чтения – 2022 : материалы Междунар. науч.-практ. конф. 19–21 апр. 2022 г. : [в 2 ч.]. / М-во культуры РФ, Рос. гос. б-ка, Библ. Ассамблея Евразии ; [сост. Е. А. Иванова] – М., 2022. – Ч. 2. – С. 340–345.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by6